ПА ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

За гэтыя гады ў парламент паступіла 13 920 пісьмовых зваротаў, 1411 грамадзян прыйшлі на прыём. Вялікая колькасць людзей звяртаецца на прыёмы ў выбарчых акругах да сваіх дэпутатаў. У асноўным гэта пытанні, якія тычацца сферы ЖКГ, забеспячэння законнасці і правапарадку, прапановы па ўнясенні змен і дапаўненняў у заканадаўства і іншыя.

> “ Заслугоўвае асаблівай увагі прапанова ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Мінскай вобласці. Яны ўздымаюць пытанне аб неабходнасці ў нашай краіне закона аб патрыятызме.

Працягваецца работа па ўдасканаленні судовай сістэмы, на што будзе нацэлена прыняцце праектаў законаў «Аб выканаўчай вытворчасці», «Аб судовых выканаўцах», «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь па пытаннях судовага ладу і судаводства». Па ініцыятыве дэпутатаў рыхтуецца новы праект Закона «Аб кампенсацыі нанесенай шкоды пацярпелым ад злачынстваў».

— Чым могуць ганарыцца заканадаўцы?

— Створанай у нашай краіне сістэмай прававых механізмаў, накіраваных на ахову правоў дзіцяці. Зроблена шмат што, аднак цяпер наспеў шэраг праблем, якія неабходна вырашыць на заканадаўчым узроўні. Менавіта на гэта накіраваны праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў». Законапраект паказвае, як важна своечасова падаць руку дапамогі такім дзецям, падтрымаць першыя нясмелыя крокі ў дарослае жыццё.

У рамках заканадаўчага забеспячэння сацыяльнай палітыкі прыняты законы аб сацыяльным страхаванні, занятасці насельніцтва, ахове здароўя. Сёння наспела неабходнасць удасканаліць сістэму дапамогі для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Гэта магчыма зрабіць праз прадастаўленне магчымасці бацькам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, атрымліваць дапамогу па доглядзе яго і адначасова працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці. Гэта палепшыць матэрыяльнае забеспячэнне сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, знізіць рызыку перадачы іх у інтэрнатныя ўстановы. Па ініцыятыве мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў укараняюцца новыя тэхналогіі сацыяльнага абслугоўвання (прыёмныя, гасцявыя сем'і і інш.), якія неабходна замацаваць на заканадаўчым узроўні. Гэтыя паслугі запатрабаваны насельніцтвам і з'яўляюцца эканамічна менш затратнымі.

— Якую ролю ў заканатворчым працэсе іграюць звычайныя грамадзяне?

— Важна адзначыць, што шмат важных прапаноў, ініцыятыў па ўдасканаленні заканадаўства паступае ад нашых людзей. Усе прапановы абавязкова разглядаюцца падчас падрыхтоўкі законапраектаў.

На мой погляд, заслугоўвае асаблівай увагі прапанова ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Мінскай вобласці. Яны ўздымаюць пытанне аб неабходнасці ў нашай краіне закона аб патрыятызме. Яны кажуць, што іх пакаленне — патрыётаў, захавальнікаў памяці нашай гісторыі, традыцый — паволі адыходзіць, а маладыя людзі не павінны страціць гэтую сувязь пакаленняў. Трэба зберагчы галоўныя каштоўнасці, закладзеныя нашымі продкамі. Падтрымліваючы ініцыятыву нашых паважаных ветэранаў, думаю, што сапраўды будзе своечасовым звярнуць увагу на тое, пра што кажа наш Прэзідэнт: мы назаўжды захаваем нашу незалежнасць, калі гэтая ідэя будзе жыць у сэрцах і душах нашых людзей.

Прыйшоў час прымаць неадкладныя дадатковыя меры па барацьбе з экстрэмізмам, тэрарызмам, аптымізоўваць палітыку ў дачыненні да мігрантаў і бежанцаў. Беларусь адчула сур'ёзнае павелічэнне колькасці мігрантаў з Украіны, але змагла даць ім прытулак, магчымасць вучыцца і працаваць. Гэта патрабуе выхаду на новы ўзровень заканадаўчага рэгулявання пытанняў рэалізацыі міграцыйнай палітыкі, атрымання беларускага грамадзянства. Прынятыя заканадаўчыя акты накіраваны на ўмацаванне іміджу Беларусі як дзяржавы, якая праводзіць паслядоўную палітыку ў гуманітарнай сферы. Адначасова гэта важны крок, які дазволіць прадухіляць злоўжыванні пры атрыманні замежнікамі статусу бежанца.

> “ За гэтыя гады ў парламент паступіла 13 920 пісьмовых зваротаў, 1411 грамадзян прыйшлі на прыём.

— Што можна сказаць пра дасягненні нашай парламенцкай дыпламатыі?

— Міралюбівы знешнепалітычны курс адкрывае новыя магчымасці для міжнароднай дзейнасці. Пашыраючы прававую базу міжпарламенцкага супрацоўніцтва, мы імкнёмся максімальна задзейнічаць парламенцкую дыпламатыю ў мэтах развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў, прасоўвання прадукцыі на замежныя рынкі, усталявання кааперацыйных сувязяў, развіцця прамога дыялогу паміж рэгіёнамі і прадстаўнікамі дзелавых колаў.

Асаблівае значэнне надаецца развіццю інтэграцыйных сувязяў з нашымі стратэгічнымі партнёрамі па Еўразійскім эканамічным саюзе. Нарошчваецца ўзаемадзеянне з Расіяй, Кітаем, Эквадорам, Пакістанам, іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. З улікам практыкі прымянення наспела неабходнасць уносіць карэкціроўкі ў Закон «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь».

yushkevich@zviazda.by

У лес, як у музей

На Лёзненшчыне гаспадыня аграсядзібы стварыла экалагічную сцежку

Віцебская вобласць — лідар у краіне па колькасці прыватных сядзіб, дзе прымаюць турыстаў. Але экалагічную сцежку стварылі толькі ля адной па ініцыятыве гаспадыні. Яна на ўскраіне вёскі Пушкі Лёзненскага раёна. Мае паэтычную назву «Дакраніся да прыгожага». Па сцежцы прайшліся і мы.

Хто такі Васька?

Святлана Пукава, старшыня Лёзненскага сельскага Савета, па дарозе да экалагічнага раю сказала, што, на жаль, ва ўсім раёне такіх энтузіястаў, як Ніна Ніканава, уладальніца сядзібы «У Нінэль», адзінкі.

У аграрным турызме многія хочуць зарабляць, але далей жадання часта справа не ідзе. Дзяржавай створаны ўсе ўмовы. Патрабуецца для гэтага занятку няшмат: трэба жыць у сельскай мясцовасці, мець дастаткова месца пад дахам, каб маглі пераначаваць прыезджыя... Ды, бадай, і ўсё. Наконт падаткаў: адна базавая велічыня ў год — гэта, пагадзіцеся, мара любога дзелавога чалавека. Але, для таго, каб справа сапраўды пачала прыносіць прыбытак і маральнае задавальненне, трэба ўмець прыняць госця прафесійна, гэта значыць так, каб ён зноў захацеў прыехаць і каб з захапленнем расказаў пра свой адпачынак усім сваім сябрам. У Ніны Ніканавай атрымліваецца менавіта так.

Святлана Пукава распавяла, што да спадарыні Ніканавай прыязджаюць па вопыт. У сядзібе праходзяць фэсты, раённыя святы, у тым ліку і спартыўныя. Ды і калі трэба штосьці цікавае паказаць гасцям Лёзненшчыны, рэдка абыходзіцца без экскурсіі на сядзібу.

Спадарыня Ніканава ў дзень візіту журналіста запрасіла ў госці сваіх аднакурснікаў. Разам вучыліся на біялагічным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута імя П.М. Машэрава (цяпер — Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт. — **Аўт.**). Яшчэ яна — прафесійны кухар! Аўтару гэтых радкоў пашчасціла ацаніць смак яе пачастунку. Гасцінная Ніна расказала, што на гэтым месцы калісьці стаяла панская сядзіба.

— Здаўна тут жылі людзі. Побач — паляна. У гонар пана яе ў народзе называюць «Васькіна гара». Да нашых дзён засталіся дрэвы з дарэвалюцыйных часоў. Славіўся пан тым, што яго сяляне атрымлівалі багатыя ўраджаі. Акрамя таго, ён вельмі любіў кветкі, таму іх было шмат у маёнтку, — сказала яна.

На жаль, нічога з архітэктурных збудаванняў пана Васіля сёння не ўбачыш. Але, відаць, ён быў добрым чалавекам, калі дагэтуль яго згадваюць з павагай.

Галоўны тут... Нічыпар

Ніна падкрэсліла, што сцежка працягласцю 1,5 кіламетра — вынік не толькі яе намаганняў. Спачатку яна як настаўніца стварала яе з вучнямі. Потым далучыліся бацькі дзятвы. Бралі ўдзел у суботніках. З дазволу райвыканкама і лясгаса выраўноўвалі сцежку. Ёсць у дарожкі і «апякун».

— Усе тутэйшыя ведаюць казку пра лесавіка дзядзьку Нічыпара. Калі я ў мясцовай школе працавала, ён быў галоўным на ўсіх святах. Віншаваў таленавітых вучняў з пачаткам новага навучальнага года, з удалымі выступленнямі на алімпіядах, а таксама выпускнікоў. Такім чынам, ужо некалькі пакаленняў маіх землякоў з павагай да Нічыпара ставяцца. Таму менавіта ён — гаспадар лесу, сцежкі, — тлумачыць крэатыўная гаспадыня сядзібы.

Дарэчы, даволі рэдкая з'ява, каб у вёсцы і наваколлі быў свой «тутэйшы герой».

Перад тым, як прайсціся па сцежцы, людзі павінны пачаставаць «гаспадара лесу». Некаторыя і грошы пакідаюць. Ёсць і свае правілы паводзін на сцежцы. У прыватнасці, нельга ламаць ніякія сучкі, наогул неяк парушаць жыццё лесу. Забараняецца і збочваць. Хоць гаспадыня па сакрэце сказала, што лес прыветлівы, таму заўсёды знойдзеш дарогу назад да цывілізацыі.

З надвор'ем нам пашанцавала. Было не горача і не холадна. Пасля «паклону» з частаваннем лесавіку, не спяшаючыся, пайшлі па сцежцы. Прафесійныя эколагі тлумачылі, што за расліна нам сустрэлася, што за дрэва... Пажартаваў, што галоднымі ў лесе яны ніколі не застануцца. Бо заўсёды ведаюць, што можна з'есці. Ды і не захварэюць, бо зёлак, карысных для здароўя, у беларускіх лясах шмат. Ніна Ніканава таксама збірае травы. Робіць з іх духмяную гарбату. Падказвае гасцям, якія зёлкі ад якой хваробы дапамагаюць вылечыцца.

На сцежцы 10 стаянак. Ёсць тут «Царства мурашкі», «Жыццё ракі»... На апошняй турыстам расказваюць пра тое, як ваявалі дзяды і прадзеды з фашыстамі. Нагадваюць пра подзвіг і пакуты нашых людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Уважлівыя могуць убачыць ля сцежкі тое, што засталося ад акопаў.

Асабліва людзям падабаюцца два дубы, якія ствараюць «Вароты шчасця». Можна загадаць жаданне, і яно абавязкова збудзецца! А яшчэ ёсць дуб у два абхваты. Многіх уражвае елка з дзвюма кронамі. Яна сімвалізуе зліццё двух сэрцаў. Побач вельмі любяць фатаграфавацца маладыя.

Што прыемна здзівіла: на сцежцы няма смецця. Па ёй ходзяць, як па музеі пад адкрытым небам.

Майстар сваёй справы

У СМІ шмат пішуць пра тое, што, дзякуючы аграрнаму турызму беларусы ў глыбінцы могуць добра зарабляць. Адзін з экспертаў нядаўна адзначыў, што дадзенае нам прыродай — дыямент, які трэба прафесійна перапрацаваць у брыльянт.

Ніна Ніканава адзначае, што першапачаткова для яе грошы не былі галоўнай мэтай. Захацелася нешта рабіць для душы, бліжэй да прыроды быць. І ёй можна верыць, бо па той жа сцежцы можна прайсці бясплатна. А на народныя святы ўбачыць, як той казаў, «за дзякуй», і аніматараў.

У канцы месяца традыцыйна пройдуць Дні адчыненых дзвярэй сельскіх сядзіб. І «У Нінэль» стане зноў месцам сустрэч. Сюды прыедуць тыя, хто плануе свой водпуск. А вопытныя і патэнцыйныя гаспадары «вясковых гатэляў» абмяркуюць прафесійныя нюансы.

Спадарыня Ніканава, дарэчы, атрымала дыплом на курсах, арганізаваных Беларускай гандлёва-прамысловай палатай. У адной з краін ЕС вучылася прымаць іншаземцаў на найлепшым узроўні.

Ахвотных адпачыць у яе, набрацца сіл шмат не толькі ў цёплы час года. Падыхаць чыстым паветрам, пахадзіць па лесе, пасядзець ля вогнішча — гэткае баўленне часу прыцягвае і ўвосень, і зімой.

У скарбонцы прафесіянала вясковага турызму ўжо шмат дасягненняў. «У Нінэль» — пераможца абласнога і рэспубліканскага конкурсаў на «Найлепшую аграэкасядзібу». Нават у Мадрыдзе былі прэзентаваны яе «турыстычны пункт» і сцежка. А гэта добрая рэклама для ўсяго раёна, вобласці і, безумоўна, краіны.

На экалагічнай сцежцы ля аграсядзібы «У Нінэль» турысты набіраюцца сіл у чыстага лясного паветра. Гаспадыня Ніна НІКАНАВА *(на першым плане)* распавядае пра дрэвы і расліны, якія растуць побач.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*
Лёзненскі раён — Віцебск.

ТЭРЫТОРЫЯ ЗДАРОЎЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У фізкультурна-аздараўленчым комплексе, першая чарга якога (басейн і дзіцячы «аквапарк») запрацавала ўжо сёлета, былі арганізаваны спаборніцтвы па плаванні паміж кіраўнікамі мясцовых прадпрыемстваў і дэпутатамі. Першыя месцы ў розных узроставых групах занялі Аляксандр Касянкоў (аддзел адукацыі, спорту і турызму), Васіль Маскалёў і Ірына Аляксеенка (дэпутаты раённага Савета), Вольга Юдзянкова (упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне). Пераможцы атрымалі ганаровыя граматы.

— Праз такога кшталту мерапрыемствы адбываецца ўмацаванне сям'і, удасканаленне форм і кірункаў працы з моладдзю, — адзначыла **старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў Анжэліка ГОМАН.** — Гэта адпавядае палітыцы дзяржавы ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця. З'яўленне ў Краснаполлі фізкультурна-аздараўленчага комплексу стала чарговым пацвярджэннем таго, што дзяржава клапоціцца пра людзей і стварае ўмовы для ўмацавання іх здароўя і заняткаў спортам.

Дарэчы, па інфармацыі аддзела адукацыі, спорту і турызму Краснапольскага райвыканкама, фізкультурай і спортам у раёне сістэматычна займаюцца каля 2 тысяч чалавек — звыш 20 працэнтаў ад усіх жыхароў раёна. У 48 секцыях спартыўнай накіраванасці задзейнічана больш за 700 навучэнцаў устаноў адукацыі раёна — палова ад агульнай колькасці.

zigulya@zviazda.by

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
21 июня 2016
Сушко С.А.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об эмиссии жилищных облигаций четырнадцатого выпуска

Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»

1. Полное и сокращенное наименование Эмитента (на белорусском и русском языках):
на белорусском языке:
полное: Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВільнюсБуд»;
сокращенное: СТАА «ВільнюсБуд»;
на русском языке:
полное: Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»;
сокращенное: СООО «ВильнюсСтрой».
2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 60, тел./факс: (8-017) 222-79-80, e-mail: Vilnusstroy@gmail.com.
3. Основные виды деятельности Эмитента.
Управление недвижимым имуществом (код 68320 согласно общегосударственному классификатору Республики Беларусь ОКРБ 005-2011 «Виды экономической деятельности»).
4. Номер расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи жилищных облигаций четырнадцатого выпуска Эмитента, наименование обслуживающего банка.
Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций четырнадцатого выпуска Эмитента (далее – Облигации) будут поступать на счет Эмитента:
получатель: СООО «ВильнюсСтрой»;
УНП получателя: 191434087;
расчетный счет:
- 3012722090012 в ОАО «Технобанк», г. Минск, ул. Кропоткина, 44, код 182;
- 3012000070758 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, код 742;
назначение платежа: оплата за жилищные облигации СООО «ВильнюсСтрой» четырнадцатого выпуска согласно договору от _____ _____ 20____ г. № _____.
5. Порядок и сроки раскрытия Эмитентом информации.
Годовой отчет Эмитента будет размещаться на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, а также публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 1 (одного) месяца после его утверждения в порядке, определенном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах.
Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Эмитента подлежит публикации в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» не позднее 2 (двух) месяцев с момента принятия соответствующего решения.
Информация о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) подлежит публикации в средствах массовой информации в течение 5 (пяти) дней с момента получения управляющим соответствующего судебного постановления.
Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии Облигаций будет размещаться на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, а также будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 7 (семи) дней с даты осуществления Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь государственной регистрации соответствующих изменений в Проспект эмиссии Облигаций.
Эмитент будет раскрывать информацию о существующих фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость Облигаций, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.
6. Сведения о депозитарии, обслуживающем Эмитента.
Наименование депозитария: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» (далее – депозитарий), код депозитария – D01.
Место нахождения депозитария: 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6В. Депозитарий зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 18.08.2000, регистрационный номер 101000004.
Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1097 Министерства финансов Республики Беларусь от 29.07.2007 (срок действия лицензии – до 29.07.2022).
7. Размер уставного фонда Эмитента.
Уставный фонд Эмитента сформирован полностью в размере, предусмотренном Уставом: 35 400 (тридцать пять тысяч четыреста) долларов США.
8. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.
Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 20.10.2010 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за регистрационным номером 191434087.
9. Дата принятия решения о выпуске Облигаций и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о четырнадцатом выпуске жилищных облигаций принято Общим собранием участников Эмитента 30 мая 2016 года (протокол б/н от 30 мая 2016 года).
10. Вид и форма Облигаций, количество Облигаций, объем выпуска Облигаций:

Вид и форма Облигаций	Жилищные, бездокументарные, именные, конвертируемые
Количество Облигаций	9 502 (девять тысяч пятьсот две) штуки
Объем выпуска Облигаций	62 713 200 000 (шестьдесят два миллиарда семьсот тринадцать миллионов двести тысяч) белорусских рублей

11. Номинальная стоимость Облигации.
Номинальная стоимость 1 (одной) Облигации составляет 6 600 000 (шесть миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (одному) метру квадратному общей площади жилого помещения по СНБ в строящемся в составе объекта «Группа жилых домов типовых потребительских качеств в границах улиц Тимирязева, Панфилова, Москвина, Репина в г. Минске» (III-я очередь – жилой дом №7 по генплану) жилом доме №7 по генплану.
Общий эквивалент номинальной стоимости Облигаций составляет 9 502 (девять тысяч пятьсот два) квадратных метра.
Эквивалент номинальной стоимости Облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения Облигаций настоящего выпуска.
12. Цель эмиссии Облигаций и направление использования средств, полученных от размещения Облигаций.
Целью эмиссии Облигаций является привлечение денежных средств физических и (или) юридических лиц для осуществления строительства объекта «Группа жилых домов типовых потребительских качеств в границах улиц Тимирязева, Панфилова, Москвина, Репина в г. Минске» (III-я очередь – жилой дом №7 по генплану), в том числе для обеспечения хозяйственной деятельности Эмитента, связанной с выполнением им функций заказчика (застройщика).
Эмитент использует средства, полученные от размещения Облигаций, в соответствии с целями эмиссии.
13. Сведения об обеспечении четырнадцатого выпуска Облигаций.
Исполнение обязательств по Облигациям обеспечивается договором №005087-16/3131 добровольного страхования ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств эмитента облигаций от 10 июня 2016 года (далее – Договор страхования), заключенным с Белорусским республиканским унитарным страховым предприятием «Белгосстрах» (далее – Ведущий страховщик) и Закрытым акционерным страховым обществом «Промтрансинвест» (далее – Состраховщик) (вместе именуемые далее – Состраховщики).
Срок действия Договора страхования составляет 680 календарных дней с 20 июня 2016 года по 30 апреля 2018 года.
Место нахождения Ведущего страховщика: 220036, г. Минск, ул. К.Либкнехта, 70; УНП 100122726.
Место нахождения Состраховщика: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 6 этаж; УНП 100357923.
По Договору страхования Состраховщики обязуются выплатить страховое возмещение выгодоприобретателю (владельцу Облигаций) при наступлении страхового случая в пределах лимита ответственности, предусмотренного Договором страхования.
Общий лимит ответственности по Договору страхования устанавливается в размере объема четырнадцатого выпуска жилищных облигаций Эмитента и составляет 62 713 200 000 (шестьдесят два миллиарда семьсот тринадцать миллионов двести тысяч) белорусских рублей. Лимит ответственности Ведущего страховщика – 95,674594822%, что составляет 60 000 600 000 (шестьдесят миллиардов шестьсот тысяч) белорусских рублей. Лимит ответственности Состраховщика – 4,325405178%, что составляет 2 712 600 000 (два миллиарда семьсот двенадцать миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей.
Сумма страхового возмещения по каждому выгодоприобретателю (владельцу Облигаций), в пределах которой несут ответственность Состраховщики по Договору страхования, определяется как сумма номинальных стоимостей Облигаций, предъявленных к погашению владельцем Облигаций.
Страховое возмещение выплачивается владельцу Облигаций каждым из Состраховщиков в пределах своей доли в страховом возмещении, равной доле принятой ими ответственности, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня составления акта о страховом случае.
14. Срок размещения Облигаций.
Датой начала открытой продажи (размещения) Облигаций является 20 июня 2016 года.
Датой окончания открытой продажи (размещения) Облигаций является 15 января 2018 года.
15. Порядок и условия размещения Облигаций.
15.1. Проведение открытой продажи Облигаций осуществляется Эмитентом самостоятельно, начиная с даты начала открытой продажи (размещения), ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 60.
До момента приобретения (как в процессе размещения Облигаций, так и в процессе их обращения) Облигаций инвесторы должны заключить с Эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилого помещения владельцу Облигаций.
15.2. Открытая продажа (размещение) Облигаций осуществляется по цене, определяемой Эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи Облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.
16. Срок обращения Облигаций устанавливается с 20 июня 2016 года по 31 января 2018 года включительно и составляет 590 календарных дней.
17. Дата начала погашения Облигаций: 31 января 2018 года.
18. Доход по Облигациям не начисляется и не выплачивается.
19. Дата и государственный регистрационный номер выпуска Облигаций.
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 21 июня 2016 года.
Государственный регистрационный номер: 5-200-02-2768.
20. Место, время и способ ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций.
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения Облигаций: ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 60. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

белагропромбанк 25 лет

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, *что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»* 29 июня 2016 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня

1. Об утверждении Кодекса корпоративного управления ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 20 июня 2016 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 21 июня по 27 июня 2016 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 27 июня 2016 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Ликвидатор объявляет о проведении 22.07.16 в 14.00 по адресу: г. Минск, Беды, 29-1Н повторных торгов по продаже имущества УП «Сеньор сыр»:

Здание детского сада. Расположено на участке 0,5249 га
(кадастровый № 623880181010001 85),
адрес: Минская обл., Логойский р-н, Янушковичский с/с, д. Янушковичи, Школьная, 6.
Начальная цена: 174 631 119 рублей без учета НДС. Шаг торгов – 5%.
Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012000578696 ОАО «Белгазпромбанк», код 742, УНП 690847681.
Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220002, Минск, а/я 33 в срок по 19.07.16 г.
Справки по тел. 80296080101.
УНП 191228804

Ликвидатор объявляет о проведении 22.07.16 в 15.00 по адресу: г. Минск, Беды, 29-1Н торгов по продаже имущества ООО «Белферумгрупп»:

IVECO ML75E18, кузов № ZCFA75D0402571350, 2010 г.в.
Начальная цена: 311 656 614 рублей с НДС (20%). Шаг торгов – 5%.
Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012801630016 в ОАО «Технобанк», код182; УНП 19144758.
Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220002, Минск, а/я 33 в срок по 19.07.16 г.
Справки по тел. 80296080101.
УНП 191228804

НАВІНЫ З РЭГІЁНА

КУЛЬТУРНЫЯ АГАРОДЖЫ

Жыхары Хойніцкага раёна заклапочаны не толькі парадкам у сваім двары, але і тым, як ён выглядае звонку.

Усё часцей у вёсках мяняюць стары драўляны плот на жалезабетонную агароджу або сучасны металапрофіль. Вяскоўцы клапоцяцца аб навядзенні парадку ва ўсім сваім населеным пункце і робяць гэта з дапамогай сродкаў самаабкладання. Іх, па звестках раённага Савета дэпутатаў, за пяць месяцаў года сабрана Br75 мільёнаў. Грошы накіроўваюцца на агароджванне сельскіх могілак, кашэнне травы. У прыватным парадку самімі грамадзянамі ўстаноўлена 1256 пагонных метраў агароджы, амаль 7000 — пафарбавана.

Паляпшаецца знешні выгляд фасадаў дамоў. На вясковых вуліцах з'яўляецца ўсё больш малых архітэктурных формаў. Напрыклад, дабавіў цікавінак ля свайго дома жыхар вёскі Віць Пётр Судзенка. Каля раней устаноўленых ім гарматы і танка з'явіўся яшчэ і самаробны самалёт з металічным пілотам.

КАБ ЭЛЕКТРЫЧКІ БЕГАЛІ БЕЗ ЗБОЯЎ

У маі беларуская чыгунка прыступіла да перавозкі пасажыраў электрацягнікамі рэгіянальных ліній эканомкласа на ўчастку Гомель — Жлобін. І гэта выклікала неабходнасць у арганізацыі рэгіянальных пунктаў кантактнай сеткі.

У Буда-Кашалёве ў такім пункце цяпер працуюць 11 чалавек, якія абслугоўваюць больш за 50 кіламетраў. Для таго, каб пераадольваць такую адлегласць, ёсць аўтаматрыса — чыгуначны вагон з асобным рухавіком. Менавіта з дапамогай яе каманда мабільная і можа лёгка выконваць работы на вышыні больш за шэсць метраў. Ад кантактнікаў залежыць праца іншых службаў, бо час ад часу патрабуецца адключыць, зазямліць кантактную сетку, забяспечыць электрычную бяспеку людзей. Каманда мае свой адміністрацыйны будынак, дзе створаны ўсе ўмовы для працы і адпачынку: душавыя, пакой прыёму ежы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.023. Нумар падпісаны ў 19.30 21 чэрвеня 2016 года.